View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



29. *Зиновьев, М.А.* Основные вопросы методики преподавания истории: руководство для преподавателя истории средней школы / М.А. Зиновьев. – М.; Л.: Изд-во АПН РСФСР, 1948. – 236 с.
30. *Бернадский, В.Н.* Изучение истории Родины в советской школе за 30 лет / В.Н. Бернадский // Ученые записки ЛГПИ им. А.И. Герцена. – 1949. – Т. 77. – С. 3–21.
31. *Бущик, Л.П.* Вопросы преподавания истории СССР: пособие для препод. средн. шк. / Л.П. Бущик. – М.: Изд-во АПН РСФСР, 1949. – 212 с.
32. *Бущик, Л.П.* История СССР в средней школе: пособие для препод. VIII класса. Ч. 1. – М.: Изд-во АПН РСФСР, 1951 – 324 с.

Summary

*The article discusses peculiarities of the study of the history of the USSR in Soviet secondary school in 1944–1959. The structure of school historical education is analyzed; normative documents, methodological and methodical positions developed in the 1930s that led to the teaching of history in this period are considered. An attempt to show the process of creating the history textbooks for secondary schools, which would correspond Marxist and Leninist ideology, and the changes that were implemented in their contents according to the changes in the policy of the Communist Party and the Soviet government is made.*

Паступіў у рэдакцыю 13.07.2012 г.

*УДК 378(476)(091):94«196/198»*

***П.А. Мацюш,***
*выкладчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

# АРГАНІЗАЦЫЯ ПАДРЫХТОЎКІ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫХ КАДРАЎ ГІСТОРЫКАЎ У СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БССР (1960-я – сярэдзіна 1980-х гг.)

Стан і перспектывы развіцця вышэйшай гістарычнай адукацыі ў значнай ступені залежаць ад яе кадравага патэнцыялу. Эфектыўнасць падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў – гэта перадумова для ўдасканалення гістарычных ведаў, пашырэння адукацыйных і вахаваўчых магчымасцей гісторыі як вучэбнай дысцыпліны, укаранення навуковых дасягненняў у вучэбны працэс.

*Мэта даследавання* – аналіз сістэмы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў у вышэйшай школе БССР у акрэслены час. Яна (сістэма) уключае мэтанакіраваную дзейнасць дзяржаўных органаў і ВНУ па арганізацыі гістарычнай навукі на розных этапах: ад адбору асоб, схільных да навукова-даследчай дзейнасці, да атэстацыі саіскальнікаў вучоных ступеней.

Сённяшнія вучоныя і педагогі – учарашнія студэнты. Цікавасць і імкненне да прафесійнага майстэрства пачынаюць фарміравацца яшчэ ў студэнцкія гады. У немалой ступені гэтаму садзейнічае арганізацыя навукова-даследчай работы студэнтаў. Яе можна падзяліць на два кірункі. Першы прадугледжвае ўключэнне навукова-даследчай работы ў вучэбны працэс. Да такіх форм адносяць выкананне дыпломных і курсавых работ, навукова-даследчых заданняў падчас вытворчай практыкі, выкладанне курса «Асновы навуковага даследавання». Другі кірунак навукова-даследчай работы праводзіцца ў пазавучэбны час і рэалізуецца ў рабоце студэнцкіх навуковых гурткоў, ва ўдзеле ў навуковых семінарах, канферэнцыях.

Характэрная тэндэнцыя з 1960-х гг. – гэта інтэграцыя адукацыі і навукі. Навыкамі навуковай работы павінны былі валодаць не толькі студэнты, якія пасля заканчэння ВНУ рэкамендаваліся да паступлення ў аспірантуру, але і тыя з іх, што накіроўваліся ў агульнаадукацыйныя школы. У прыватнасці, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР В.П. Ялюцін адзначаў: «Малады спецыяліст, выпускнік савецкай вышэйшай школы … павінен быць чалавекам творчым і добра валодаць сучаснымі метадамі навуковых даследаванняў. Гэтым тлумачыцца той факт, што навуковая работа на сучасным этапе стала неад’емнай часткай дзейнасці ВНУ, навука і адукацыя неаддзельныя адна ад адной» [12, л. 108].

Такім чынам, развіццё навукова-даследчай работы студэнтаў ВНУ з’яўлялася актуальным напрамкам партыйна-дзяржаўнай палітыкі ў вышэйшай школе. У галіне арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў была створана грунтоўная нарматыўная база, што дазволіла ахапіць ёй большую частку студэнтаў ВНУ БССР. Так, па даных Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, у пачатку 1980-х гг. у навукова-даследчай рабоце прымалі ўдзел 92,3 % студэнтаў дзённай формы навучання [14, л. 180]. Вышэйадзначанае стварала перадумовы для далучэння да навукі таленавітай моладзі.

У пастановах ЦК КПБ і СМ БССР «Аб мерах па паляпшэнні падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў у Беларускай ССР» (1961 г.) і «Аб мерах па далейшым паляпшэнні падбору і падрыхтоўкі навуковых кадраў у Беларускай ССР» (1962 г.) вызначалася ўпарадкаванне падрыхтоўкі маладых вучоных па галінах навук і аптымальная для рэспублікі колькасць аспірантаў [18, с. 116–117].

У пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб паляпшэнні падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў» (1967 г.) з мэтай узмацнення прытоку ў навуку моладзі праду-

Рэпазіторый БДПУ

гледжвалася залічэнне ў аспірантуру лепшых выпускнікоў вышэйшай школы адразу пасля заканчэння ВНУ. Такім чынам, у ВНУ з'явілася магчымасць пакідаць сабе выпускнікоў, якія ўжо праявілі свае навуковыя здольнасці падчас навучання, з перспектывай іх навуковага росту.

Для ўдасканалення планавання і кантролю за работай аспірантуры значнымі функцыямі надзяляўся Дзяржплан БССР. Агульнае навукова-метадычнае кіраўніцтва аспірантамі ў ВНУ ўскладалася на Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

Аспірантура як асноўная форма падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў у сістэме вышэйшай школы функцыянавала пры БДУ і Мінскім педагагічным інстытуце, а ў 1968 г. была адкрыта ў Гродзенскім педагагічным інстытуце. Пры гэтым БДУ выступаў у якасці адзінай ВНУ, якая забяспечвала падрыхтоўку навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў на ўсіх этапах: ад паступлення ў аспірантуру і да абароны дысертацыі.

У 1968 г. «Палажэннем аб саіскальніках вучоных ступеней, якія працавалі над дысертацыямі па-за аспірантурай», быў вызначаны прававы статус дадзенай формы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў. Выніковасць дзейнасці саіскальнікаў праявілася ў тым, што ў БДУ з 1962 па 1970 г. імі было абаронена 15 дысертацый, у той жа час аспірантамі – 30. Такім чынам, у 1960-я гг. саіскальнікамі абаранялася кожная трэцяя з падрыхтаваных у сістэме ВНУ дысертацый [6].

У Гродзенскім педагагічным інстытуце адкрыццё аспірантуры было станоўчым крокам, але поўнасцю не вырашала праблемы працаўладкавання яе выпускнікоў. Падрыхтоўка кадраў у аспірантуры ажыццяўлялася для ўсіх кафедр гісторыка-педагагічнага факультэта Гродзенскага педагагічнага інстытута і гістарычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Практыкаваўся прыём новых выкладчыкаў на кафедры без аспіранцкай падрыхтоўкі, што ўскладняла працаўладкаванне выпускнікоў аспірантуры [2, л. 18]. Акрамя таго, падрыхтоўка ў аспірантуры без магчымасці далейшай абароны дысертацый ва ўстанове навучання стрымлівала рост кадравага патэнцыялу кафедр гісторыі. Амаль усе выкладчыкі кафедры гісторыі БССР і 60 % выкладчыцкага складу кафедры ўсеагульнай гісторыі Гродзенскага ўніверсітэта абаранілі кандыдацкія дысертацыі ў БДУ. Вядучыя прафесары БДУ з'яўляліся навуковымі кіраўнікамі аспірантаў, якія праходзілі там мэтавую падрыхтоўку [7].

У Магілёўскім педагагічным інстытуце на працягу вывучаемага перыяду аспірантуры па гісторыі не было. Падрыхтоўка кадраў гісторыкаў ажыццяўлялася, па-першае, шляхам накіравання саіскальнікаў у мэтавую аспірантуру пры вядучых навуковых установах і ВНУ рэспублікі, па-другое – праз асістэнтуру. Другі шлях быў больш зручным. На яго ўказвалі кіраўніцтва гістарычнага факультэта, загадчыкі кафедр гісторыі СССР і БССР і ўсеагульнай гісторыі. Для гэтай мэты ў штаты вышэйзгаданых кафедр уводзіліся стаўкі асістэнтаў [3, л. 43].

Неабходна таксама ўлічваць, што пры падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў не патрабавалася такой эксперыментальнай базы, як для тэхнічных і прыродазнаўчых навук. Такім чынам, тут у большай ступені магло быць выкарыстана саіскальніцтва і завочная аспірантура.

Завочная форма падрыхтоўкі аспірантаў-гісторыкаў патрабавала меншых фінансавых выдаткаў, але вынікі яе работы былі сціплымі. Па даных, прыведзеных І.І. Шаўчуком, пры значнай колькаснай перавазе аспірантаў-завочнікаў з 24 чалавек, якія закончылі навучанне ў сістэме МВ ССА БССР у 1971–1979 гг. з адначасовай абаронай дысертацыі, 15 (62,5 %) навучаліся з адрывам ад вытворчасці і 9 (37,5 %) – без адрыву ад вытворчасці. Саіскальніцтва як форма падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў у 1970-я гг. было менш эфектыўным у параўнанні з папярэднім перыядам (у БДУ саіскальнікамі абаранялася кожная пятая дысертацыя) [20]. Адна з прычын такога становішча заключалася ў іх навуковым кіраўніцтве. Яно ажыццяўлялася не належным чынам. У прыватнасці, за кіраўніцтва саіскальнікамі не прадугледжваўся ўлік нагрузкі. Дактары навук у асноўным прыцягваліся да кіраўніцтва аспірантамі, на падрыхтоўку якіх адводзілася большая колькасць гадзін. Абмежаваны час, што вылучаўся для працы з саіскальнікамі, як правіла, не аплачваўся. Напрыклад, у Мінскім падінстытуце для гэтай мэты адводзілася 15 гадзін (для кіраўніцтва апірантамі-завочнікамі – 50).

У 1970-я гг. узнікла новая форма падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў. Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшым ўдасканаленні вышэйшай адукацыі ў краіне» (1972 г.) уводзіліся пасады стажораў-выкладчыкаў. Стажыроўкі ўстанаўліваліся з мэтай набыцця выпускнікамі ВНУ практычных уменняў і назапашвання педагагічнага вопыту.

Тым не менш гадавы тэрмін стажыроўкі выкладчыкаў аказаўся недастатковым. Акрамя таго, час, затрачаны на кіраўніцтва стажорамі-выкладчыкамі, залічваўся па нормах, устаноўленых для аспірантаў. У далейшым названая форма не атрымала належнага распаўсюджвання, паколькі адцягвала высокакваліфікаваных спецыялістаў ад кіраўніцтва аспірантамі.

Аператы̆ўнай формай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі была аднагадовая аспірантура. У яе залічваліся галоўным чынам выкладчыкі ВНУ, якія мелі стаж навуковай ці педагагічнай дзейнасці, здалі экзамены

Рэпазіторый БДПУ

кандыдацкага мінімуму, выканалі навукова-даследчую работу па выбранай тэме ў аб'ёме, дастатковым для абароны кандыдацкай дысертацыі, і мелі публікацыі па сваёй тэме [6].

Варта адзначыць, што падрыхтоўка дактароў навук у галіне гісторыі на працягу акрэсленага перыяду адбывалася ва ўмовах адсутнасці дактарантуры. Для завяршэння доктарскіх дысертацый прадугледжвалася прадастаўленне саіскальнікам творчых адпачынкаў, іх перавод на пасады старшых навуковых супрацоўнікаў. Пры прысваенні вучонай ступені доктара навук улічвалася не толькі якасць педагагічнай работы, але і наяўнасць публікацый саіскальніка.

Нельга сказаць, што такі парадак падрыхтоўкі дактароў навук стаў сістэмнай з'явай. Так, дактарамі гістарычных навук у 1972 г. сталі 2 дацэнты, якія ў канцы 1960-х гг. знаходзіліся на пасадах старшых навуковых супрацоўнікаў. У 1975 г. яшчэ 2 саіскальнікі завяршылі працу над доктарскімі дысертацыямі. Разам з тым, выкладчыкі гістарычнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута не выкарыстоўвалі магчымасці для павышэння кваліфікацыі. Напрыклад, на кафедры гісторыі СССР у 1970-я гг. з 5 кандыдатаў навук над доктарскай дысертацыяй працаваў толькі 1 чалавек. Ніхто не планаваў пераход на пасаду старшага навуковага супрацоўніка [20].

Асаблівае месца ў структуры падрыхоўкі навукова-педагагічных кадраў займалі спецыялісты грамадазнаўчага профілю. Выкананне прынятых партыйных і ўрадавых пастаноў садзейнічала колькаснаму і якаснаму росту навукова-педагагічных кадраў кафедр грамадскіх навук ВНУ рэспублікі [18, с. 120]. Гэта пацвярджаецца станоўчай колькаснай і якаснай дынамікай. Калі ў 1961 г. функцыянавала 37 кафедр грамадскіх навук, на якіх працавалі 345 выкладчыкаў, то ў 1968 г. – 67 кафедр з колькасцю навуковых супрацоўнікаў звыш 700.

Пастановай ЦК КПСС «Аб рабоце па падборы і выхаванні ідэалагічных кадраў у партыйнай арганізацыі Беларусі» (1974 г.) прадугледжвалася павышэнне якасці вывучэння педагогікі і псіхалогіі, прапагандысцкага майстэрства, перадавога вопыту арганізацыі ідэйнага выхавання мас. У дакуменце гаварылася пра пашырэнне і паляпшэнне працы аспірантуры ў педагагічных ВНУ з мэтай поўнага ўкамплектавання кафедр выкладчыкамі вышэйшай навуковай кваліфікацыі. Рэалізацыя пастановы прывяла да істотнага росту колькасці кафедр грамадскіх навук ВНУ рэспублікі. У 1978 г. функцыянавалі ўжо 95 кафедр грамадскіх навук з агульнай колькасцю супрацоўнікаў – 1161 чал. З іх дактароў навук – 47 чал. (4,0 %), кандыдатаў навук – 596 (51,0 %) [13, л. 74].

У сярэдзіне 1970-х гг. аптымізуецца структура падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў у галіне грамадскіх навук. У адпаведнасці з рашэннем калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР была пашырана падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў па грамадскіх навуках у Беларускім дзяржаўным універсітэце за кошт яе скарачэння ў іншых ВНУ рэспублікі, якія не мелі адпаведных аддзяленняў і высокакваліфікаваных навуковых кадраў грамадазнаўцаў.

Кадравы склад кафедр грамадскіх навук, асабліва гэта датычылася кафедры гісторыі КПСС, камплектаваўся са спецыялістаў гістарычнага профілю. Пасады загадчыкаў дадзеных кафедраў уваходзілі ў наменклатуры пасад, супрацоўнікі якіх персанальна зацвярджаліся асобнымі рашэннямі ЦК КПБ. Такім чынам, прафесійную прыгоднасць выкладчыкаў кафедр гісторыі КПСС і гісторыі СССР вызначалі партыйныя работнікі.

Важным этапам у развіцці сістэмы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў стала пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 18 кастрычніка 1974 г. «Аб мерах па далейшым удасканаленні атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў». Вышэйшая атэстацыйная камісія пры Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР пачала падпарадкоўвацца непасрэдна Савету Міністраў СССР. На ВАК ускладаліся задачы забеспячэння высокага ўзроўню і адзінства патрабаванняў да атэстацыі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі. Такім чынам, упершыню ў гісторыі парадак атэстацыі вызначаўся ўрадам [1, с. 34]. Прыняты дакумент прадугледжваў грунтоўны аналіз тэматыкі дысертацый, высокія патрабаванні на кандыдацкіх экзаменах. Рэалізацыя пастановы прадугледжвала таксама павышэнне патрабаванняў да саіскальнікаў вучоных ступеней і якасць ацэнкі дысертацыйных даследаванняў на ўсіх этапах атэстацыі: ад зацвярджэння тэмы і да экспертызы кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый у ВАКу СССР.

Вынікі функцыянавання сістэмы атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў у галіне гісторыі былі падведзены на нарадзе кіраўнікоў спецыялізаваных саветаў па гістарычных навуках у 1984 г. у Кіеве. У выніковых дакументах нарады ўтрымліваліся прынцыповыя патрабаванні да даследаванняў у галіне гісторыі, якія не страцілі сваёй актуальнасці і на сённяшні дзень. Для кандыдацкіх дысертацый у галіне гісторыі крытэрыямі значнасці выступала атрыманне навуковых вынікаў, якія мелі істотнае значэнне для дадзенай спецыяльнасці [17, с. 23–24].

Аналіз статыстычных даных, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, дазваляе адлюстраваць колькасны бок падрыхтоўкі аспірантаў-гісторыкаў у сістэме вышэйшай школы БССР (табліца) [8, л. 29; 9, л. 2; 10, л. 52; 11, л. 29; 15, л. 62; 16, л. 14].

Рэпазіторый БДПУ

***Табліца* – Дынаміка колькасці аспірантаў-гісторыкаў у сістэме ВНУ БССР (1961–1985 гг.)**

| Год | 1961 | 1965 | 1970 | 1975 | 1980 | 1985 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Агульная колькасць аспірантаў | 17 | 38 | 70 | 76 | 95 | 74 |
| Навучанне з адрывам ад вытворчасці | 12 | 18 | 41 | 24 | 40 | 39 |
| Навучанне без адрыву ад вытворчасці | 5 | 20 | 29 | 52 | 55 | 35 |

Такім чынам, на працягу акрэсленага перыяду назіраецца наступная дынаміка колькасці аспірантаў па розных гістарычных спецыяльнасцях. Імклівае развіццё ў 1970-я гг. набывае завочная аспірантура. У першай палове 1980-х гг. адбываецца змяншэнне колькасці аспірантаў-гісторыкаў, што тлумачыцца агульным скарачэннем аб'ёму аспіранцкай падрыхтоўкі ў ВНУ і акадэмічных установах рэспублікі [5, с. 9].

Пры разглядзе абароны доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый у сістэме вышэйшай школы БССР як заканамернага выніку падрыхтоўкі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі варта прывесці некаторыя абагульняльныя лічбы. Усяго з 1961 па 1985 г. у БДУ было абаронена 25 доктарскіх дысертацый: 9 – па гісторыі КПСС і КПБ, 9 – па гісторыі СССР і БССР, 5 – па ўсеагульнай гісторыі, 2 – па журналістыцы.

Аб выніковасці падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў у ВНУ БССР сведчыць наступная дынаміка абароны кандыдацкіх дысертацый амаль па ўсіх кірунках. Так, у БДУ з пачатку 1960-х гг. і да сярэдзіны 1980-х гг. колькасць абароненых кандыдацкіх дысертацый па гісторыі КПСС-КПБ узрасла ў 2,5 раза (з 20 да 50); па гісторыі СССР і БССР – у 2,6 раза (з 6 да 16); па ўсеагульнай гісторыі – у 5,3 раза (з 3 да 16). У МДПІ адпаведныя колькасныя паказчыкі па гісторыі КПСС-КПБ павялічыліся ў 3,3 раза (з 3 да 10 дыс.). Усяго ў сістэме вышэйшай школы БССР за акрэслены перыяд было абаронена 315 кандыдацкіх дысертацый па гісторыі [4, с. 31–111].

Такім чынам, развітая сістэма навукова-даследчай работы студэнтаў была адным з фактараў прыцягнення моладзі ў навуку. У сістэме вышэйшай школы толькі дзве ВНУ (БДУ і МДПІ) мелі магчымасць поўнасцю забяспечыць працэс і вынікі падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў. Разглядаючы абарону доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый у галіне гісторыі як вынік падрыхтоўкі адпаведных навукова-педагагічных кадраў можна адзначыць станоўчую дынаміку. Павышаліся патрабаванні да навуковых даследаванняў у галіне гісторыі, але іх тэматыка кардынальна не мяняліся. Разам з тым, ні адна з форм, якія разгледжаны ў артыкуле, не былі дасканалымі. Толькі іх спалучэнне прыносіла свой плён. Без вырашэння засталася і праблема своечасовасці абароны дысертацый саіскальнікамі вучоных ступеней.

Літаратура і крыніцы


1. *Гусев, К.В.* Кадры советской науки : к 50-летию совет. системы аттестации науч. и науч.-пед. кадров / К.В. Гусев, Б.С. Розов. – М. : Знание, 1982. – 64 с. – (Новое в жизни, науке, технике. Серия «История» ; № 7).
2. ДАГВ. – Фонд 991. – Воп. 3. – Спр. 345. План работы, пратаколы пасяджэнняў дэканата і Савета, справаздача аб рабоце гістарычнага факультэта за 1979/1980 навучальны год.
3. ДАМВ. – Фонд 927. – Воп. 1. – Спр. 656. Отчеты о работе факультетов за 1976/1977 учебный год.
4. Докторские и кандидатские диссертации по историческим наукам БССР, 1944–1987 гг. : библиогр. указ. / Гос. б-ка БССР, Ин-т истории Акад. наук БССР ; сост.: В.Н. Михнюк, Л.Н. Новицкая. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск : [б. и.], 1988. – 126 с.
5. *Корзенко, Г.В.* Научная интеллигенция Беларуси в 1944–1990 гг.: подготовка, рост, структура / Г.В. Корзенко ; Акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Fico : А-СКАД, 1996. – 76 с.
6. *Леанавец, В.Ц.* Удасканальванне арганізацыі гістарычнай навукі ў БССР (60-я гады) / В.Ц. Леанавец // Вес. Акад. навук БССР. Сер. грам. навук. – 1986. – № 1. – С. 73–79.
7. *Мараш, Я.Н.* Содружество кафедр / Я.Н. Мараш // Вопр. истории: межведомств. сб. / Мин. гос. пед. ин-т ; редкол.: В.М. Фомин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1985. – Вып. 12. – С. 40–45.
8. НАРБ. – Фонд 30. – Воп. 9. – Спр. 2647. Данные ЦСУ СССР и БССР о числе научных учреждений и численности работающих в них на 1 января 1970 г., общеобразовательных школ на начало 1970/71 учебный год, загородных пионерских лагерей за 1970 г.
9. НАРБ. – Фонд 30. – Воп. 9. – Спр. 4267. Статистические данные ЦСУ БССР по статистике народного образования, науки и культуры за 1975 г., принятые ЦСУ СССР.
10. НАРБ. – Фонд 30. – Воп. 9. Спр. 6089. Статистические данные ЦСУ БССР о сети научных учреждений, численности и составе научных работников и подготовке научных кадров через аспирантуру на 1 января 1981 г., числе массовых библиотек, народных университетов на 1 июня 1980 г., числе общеобразовательных школ, высших и средних специальных учебных заведений на начало 1980/81 учебного года.
11. НАРБ. – Фонд 30. – Воп. 9. – Спр. 7817. Статистические данные по статистике народного образования, науке и культуре БССР за 1985 г., принятые ЦСУ СССР – арк. 29
12. НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 8. – Спр. 2934. Протоколы №1-20 заседаний кафедры истории БССР и документы к ним.
13. НАРБ. – Фонд 1220. – Воп. 2. – Спр. 1057. Переписка с ЦК КПБ, СМ БССР, СМ СССР, Минвузом СССР с народным контролем БССР о работе высших учебных заведений.
14. НАРБ. – Фонд 1220. – Воп. 3 – Спр. 238. Справки, докладные записки в Совет Министров БССР, переписка с Минвузом СССР и другими Министерствами и ведомствами о состоянии и развитии народного образования в БССР.
15. НАРБ. – Фонд 1250. – Воп. 1. – Спр. 1123. Сводные отчеты МСС, Министерств, ведомств и научно-исследовательских учреждений, имеющих аспирантуру, на 1 января 1962 года.
16. НАРБ. – Фонд 1250. – Воп. 1. – Спр. 2680. Отчеты МСС о работе аспирантуры, численности аспирантов по отраслям наук, специальностям, научным учреждениям и списки учреждений, имеющих аспирантуру на 1 января 1966 г. (ф–1НК).
17. Совещание руководителей специализированных советов по историческим наукам по вопросам совершенствования подготовки и аттестации научных и научно-педагогических кадров в свете решений XXVI съезда КПСС и последующих пленумов ЦК КПСС // Бюл. Высш. аттестац. комис. при Совете Министров СССР. – 1985. – № 6. – С. 22–25.
18. *Соколов, Н.К.* Партийное руководство подготовкой и воспитанием кадров высшей школы / Н.К. Соколов. – Минск : Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1978. – 143 с.
19. *Шаршунов, В.А.* Становление национальной системы подготовки и аттестации ученых и педагогов высшей квалификации / В.А. Шаршунов. – Минск : Мисанта, 2008. – 238 с.
20. *Шаўчук, І.І.* Арганізацыя гістарычнай навукі ў БССР, 70-я гады / І.І. Шаўчук // Весці Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1988. – № 3. – С. 65–71.


Рэпазіторый БДПУ

SUMMARY

The author focuses on the topical issues of strengthening staff capacity of historical science and higher history education since the early 1960's. to mid-1980s. The article deals with the official documents of the party and state authorities. Based on statistics forms and results of training of the teaching staff of historians are analyzed. The dynamics of theses defence in higher school of Belarus in the period is shown.

Паступіў у рэдакцыю 27.02.2013 г.

*УДК 94(476):81'272«1937/1939»*

***М.К. Альховік,***
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ*

# ПАЛІТЫКА КІРАЎНІЦТВА БССР У МОЎНЫМ ПЫТАННІ (1937–1939 гг.)

Моўная палітыка партыйна-савецкага кіраўніцтва канца 1930-х гг. стала аб'ектам даследавання яшчэ ў савецкі перыяд [1–2]. У апошні час моўная палітыка бальшавікоў у адносінах польскага, яўрэйскага, латышскага і насельніцтва іншых нацыянальнасцей знайшла адлюстраванне і асэнсаванне ў дысертацыях В.М. Жука «Польская нацыянальная меншасць у БССР», А.Л. Дзядзінкіна «Нацыянальная палітыка савецкай улады ў лістападзе 1917 – верасні 1939 гг. (на прыкладзе Віцебшчыны)», у кнігах і артыкулах беларускіх і замежных даследчыкаў [3–4].

У дадзеным артыкуле галоўная ўвага звернута на тыя моманты моўнай палітыкі, што яшчэ не атрымалі належнага асвятлення і асэнсавання ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Вывучэнне ўсіх аспектаў супярэчлівай нацыянальнай палітыкі канца 1930-х гг. дазволіць адказаць на пытанне аб яе сутнасці і накіраванасці.

**Агульны напрамак палітыкі савецкай улады ў моўным пытанні ў 1937–1939 гг.** У канцы 1930-х гг. партыйна-савецкае кіраўніцтва БССР прыступіла да рэалізацыі лініі ЦК УКП(б) і СНК СССР, накіраванай на асіміляцыю нацыянальных меншасцей БССР і згортванне палітыкі беларусізацыі. Выпрацоўка канцэпцыі новай палітыкі і практычных мерапрыемстваў партыйна-дзяржаўных органаў па нацыянальным пытанні ў 1937–1939 гг. адбывалася на пасяджэннях Бюро ЦК КП(б)Б, пленумах ЦК КП(б)Б і з'ездах КП(б)Б у поўнай адпаведнасці з указаннямі ЦК УКП(б) і СНК СССР. У справе фарміравання канцэпцыі нацыянальнай палітыкі пазіцыя радавых камуністаў, савецкіх работнікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі і грамадскіх арганізацый, а таксама здабыткі папярэдняй нацыянальнай палітыкі не мелі практычна ніякага значэння.

Верхняй храналагічнай мяжой перыяду з'яўляецца перапіс насельніцтва, праведзены ў студзені 1937 г., падчас якога савецкая ўлада шырока папулярызавала беларускую мову і культуру. З гэтага часу ў БССР праводзілася выключна асіміляцыйная палітыка, і адзінай этнічнай супольнасцю, аб якой клапацілася партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва, з'яўлялася руская. Гэта лінія ў нацыянальным будаўніцтве часткова змянілася толькі пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР, што і з'яўляецца ніжняй храналагічнай мяжой.

**Палітыка ў адносінах да беларускай мовы.** На XVI з'ездзе КП(б)Б (праходзіў 10–19 чэрвеня 1937 г.) у абарону палітыкі беларусізацыі выступілі толькі дэлегат з Оршы С.Ц. Хаўкін і першы сакратар ЦК КП(б)Б В.Ф. Шаранговіч. Яны фактычна прызналі невыкананне на ўсіх узроўнях улады і кіравання нават тых фармальных і павярхоўных пастаноў па беларусізацыі, якія былі прыняты ў сярэдзіне 1930-х гг. І тым не менш у рэзалюцыях XVI з'езда КП(б)Б пытанні моўнай палітыкі не былі адлюстраваны [5, л. 149].

На задавальненне этнакультурных патрэб беларускага насельніцтва павінна было паўплываць рашэнне задач, вызначаных першым сакратаром ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка ў запісцы на імя І.В. Сталіна «Аб беларускай мове, літаратуры і пісьменніках», якая датуецца 21 лістапада 1938 г. Па-першае, П.К. Панамарэнка адзначыў неабходнасць карэннага набліжэння беларускага правапісу, граматыкі і лексікі, быццам бы скажоных «у нацыяналістычным духу», да рускай мовы. Гэта прапанова была ў рэчышчы кампаніі па русіфікацыі ўкраінскай мовы, ініцыяванай газетай «Правда» ў 1937 г. У выніку, у 1938–1941 гг. у перыядычных выданнях быў надрукаваны шэраг праектаў беларускага правапісу, аўтары якіх спаборнічалі ў справе збліжэння беларускай мовы з рускай. Па-другое, у рэспубліцы планавалася павялічыць колькасць рускіх школ, але за кошт новых, бо «рэарганізацыя некаторага ліку беларускіх школ у рускія, хоць і з'яўляецца практычна мэтазгоднай, але палітычна недапушчальнай». П.К. Панамарэнка таксама адзначаў, што толькі рускія кнігі і часопісы карыстаюцца папулярнасцю ў беларускага насельніцтва, з чаго лагічна паўставала задача павелічэння рускамоўнай друкаванай прадукцыі ў БССР [6, л. 25].

Рэпазіторый БДПУ